*Гладышчук А.А.*

# Дзевяць прыярытэтаў Берасця XVI—XVII стст.



Берасце — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, які першы раз дакладна ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах пад 1019 годам[1]. Гэта азначае, што зусім хутка трэці па ўзросце горад Беларусі, пасля Полацка і Турава, справіць сваё 1000-годдзе. Сапраўдны інтарэс да старажытнага горада Заходняй Русі з'явіўся пасля фенаменальнага адкрыцця беларускім археолагам П.Ф. Лысенкам драўлянай часткі старажытнага горада[2], што дазволіла пасля правядзення незвычайных археалагічных раскопак на гэтым месцы адкрыць унікальны і пакуль адзіны такога тыпу археалагічны музей «Бярэсце»[3].

Існуе некалькі версій паходжання гэтай рэдкай назвы старажытнага горада Заходняй Русі — Берасце. Але, на погляд шмат якіх даследчыкаў, найбольш верагоднай здаецца, што гэтую назву мог даць вяз-бераст (Ulmus), які мае мясцовую назву карагач і мог ў тыя часы займаць дастатковыя плошчы ў даліне Буга, дзе ён менавіта сустракаецца і сёння.

---

1 Повесть временных лет. М. ; Л., 1951. Ч I. С. 98.

2 Лысенко П. Ф. Берестье. Минск, 1985. 399 с.

3 Гладышчук А. А. Бярэсце — горад старажытны // Родная прырода. 1983. № 6. С. 12—13. ; Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. Мн., 1989. 159 с. ; Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. 2-е изд., доп. Минск, 2007. 181 с.

У працы ўпершыню робіцца спроба сістэматызаваць матэрыял і звярнуць увагу на тыя абставіны, якія рабілі старажытны горад Русі Берасце ў сярэднявечныя часы адным з найважнейшых у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, і падкрэсліць прыярытэтнасць напрамкаў яго развіцця ў сэнсе адносін да гісторыі Беларусі.

## І. ЗАМАК

***«Вежъ замковыхъ пять направныхъ: На одной зекгаръ одъ места,*** *(л. 292)* ***которий завжди бъеть. Другая вежа од Мухавца на всходъ сонца; третея одъ Замуховечя наполъ до полудне; четвертая от Буга на полудне летнее; пятая над броною старою зъ кганкомъ на верху, на которой на верху звонъ великий з Вол[ы]ни привезенихъ»***[4].

Гэта пакуль адзіная вядомая пісьмовая лакалізацыя 1566 года ў прасторы вежаў Берасцейскага замку, якая вельмі дакладна супадае з тапаграфічнай, зробленай шведскім мастаком-баталістам Э. Дальбергам[5] праз 90 гадоў пасля прыведзенага апісання ў 1657 годзе, што, безумоўна, выпадковым быць не можа. Сапраўды, Берасцейскі замак на працягу стагоддзяў з'яўляўся галоўнай дамінантай старажытнага Берасця і займаў значнае месца ў палітычным і эканамічным стане дзяржавы адразу ж пасля сталіцы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага — Вільні.

Гісторыя Берасцейскага замку, трэба меркаваць, сваім пачаткам узыходзіць да заснавання самога горада старажытнай Русі, але першыя пісьмовыя ўпамінанні менавіта самога замку знаходзім у польскіх крыніцах крыху пазней, аб чым Мацей Стрыйкоўскі піша наступным чынам[6]: «*Zatym też Brzeście Litewskie, roku od narodzneia Christosa Pana 1182, z posluszenstwa się Polskiego wybiło i wszystek on kraj do Ruskiego przełożeństwa znowu przysłąpil. Co słysząc Kazimirz, xiąże Polskie, obległ Brzeście, i dobywszy go za 12 dni sturmem ustaniecznym, winniejshych na gardle skarał, i zamek nad miastem zbudował, ktory Polskimi żołnierzami przeciw Rusakow osadził, jako Długosz, Miechovius fol. 103, Wapowski, Bielski fol. 248, świadcza*».

---

4 Описание староства Берестейскаго 1566 года // Документы Московского архива Министерства юстиции / под ред. М. Довнара-Запольского. М., 1897. Т. 1. С. 205—448.

5 Dahlberg E. Plan of Brest. 1657. // Kotljarchuk A. In the Shadows of Poland and Russia. The Grand Duchy of Lithuania and Sweden in the European Crisis of the mid-17th Century. Stockholm, 2006. S.303.

6 Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmódska i wszystkiej Rusi // Zbiór dzijepisów polskich. Warszawa, 1846. T. I. S. 203.

Яшчэ раней аб гэтай падзеі паведаміў Ян Длугаш, польскі гісторык, у сваёй шматтомнай «Гісторыі Польшчы», над якой ён працаваў у 1469—1480 гг. і на якога спасылаецца М. Стрыйкоўскі[7]: «*Лета Божага 1182, Казімір, князь і манарх польскі, даведаўшыся аб выхадзе з паслушэнства Берасцейскай зямлі і яе сталіцы, размешчанай над ракой Буг, адразу ж узяўся за зброю і, сабраўшы войска як коннае, так і пешае, хуткім маршам прыбыў пад Берасце (Brześć), узяў у аблогу яго і праз дванаццаць дзён узяў горад сілай. Пасля чаго галоўных віноўнікаў мяцяжа (rokoszu) пакараўшы смерцю і замак над горадам (grodek nad miastem) паставіўшы, забяспечыў яго моцнай залогай, каб утрымаць народ у паслушэнстве перад страхам кары*».

З гэтага выцякае, што ўжо ў 1182 годзе ў Берасці існавала добра ўмацаваная частка горада, якая і з'яўлялася ягонай фартэцыяй альбо замкам. Адна з першых нататак пра Берасцейскі замак, якую на сённяшні дзень маем, датуецца дакладна — **1182 годам!** Не лішнім будзе сказаць, што ў «Великой хронике о Польше, Руси и их соседях XI—XIII вв.»[8] пра Берасце ідзе размова толькі адзін раз і якраз у сувязі з падзеямі, пра якіх гаворыцца вышэй, у 39-й частцы: «*Случилось так, что город Руси Берестье, отказавшись от повиновения Казимиру, перестал выплачивать обычные подати и стал готовить оружие для сопротивления Казимиру. Последний, собрав отряд храбрых воинов, в году от Р. Х. 1182 пошёл против него и его князя и внезапно мужественно его [город] атаковал и захватил*».



Заўважым, польская, а не руская хроніка адназначна сцвярджае, што Берасце з'яўлялася горадам Русі і нават мела асабістага князя, г. зн. Берасцейская зямля магла набыць на той час статут удзельнага княства, а князь, вядома, мог пабудаваць замак, у якім знаходзілася ягоная рэзідэнцыя. Як бы там ні было, але Берасцейскі замак паўнапраўна можа адлічваць сваю гісторыю з 1182 года.

Калі пазнаёміцца з працамі вядомага беларускага гісторыка М. Ткачова[9] пра замкі Беларусі, то, на жаль, там не знойдзецца даты пра першую згадку Берасцейскага замка, якая ў параўнанні з іншымі прыведзенымі ў ягоных манаграфіях датамі з'яўляецца найстаражытнейшай.

7 Jana Długosza kanonika krakowskiego Dziejów polskich ksiąg dwanaście / przekład Karola Mecherzyńskiego. Cracoviae : Typogr. «Czas» (Fr. Kluczycki), 1863—1887.

8 Великая хроника о Польше, Руси и их соседях XI—XIII вв. / под ред. В. Л. Янина. М., 1987. С. 122.

9 Ткачёв М. А. Замки Белоруссии. Минск, 1987. 221 с. ; Ткачёв М. А. Замки Беларуси. Минск, 2005. 200 с.

## II. РАТУШЪ МЕСЦКІЙ

***«Право тому мѣсту нашому Берестейскому предкове наши, короли и великіи князи ихъ милость пожаловали, на имя Майтборское, то есть Нѣмецкое»***[10].

Як добра вядома, Магдэбургскае права Берасце атрымала першым сярод беларускіх гарадоў 15 жніўня 1390 года, амаль на стагоддзе раней, чым іншыя месцы, якім гэтае права было даравана. Але сёння большасць тых іншых беларускіх гарадоў ганарыцца і з розумам выкарыстоўвае ў патрыятычных мэтах свае адбудаваныя ратушы, а нам ніяк не ўдаецца лакалізаваць месца, у якім знаходзілася ратуша, таму што гэтае месца сёння належыць «Брэсцкай крэпасці».

Пісьмовае ўдакладненне, дзе на Рыначнай плошчы Старога гораду знаходзілася ратуша, данесла нам «Описаніе староства Берестейского 1566 года»: *«Другая полатъ ринку. Ратушъ месцкий — 2 $^1/_2$ прута»*. Гэты запіс, як і план Фюрстэнгофа[11], дапамог прыблізна вызначыць магчымае месца лакалізацыі ратушы Берасця[12]. Але для дасканалага вырашэння гэтай праблемы патрабаваліся больш канкрэтныя даследаванні[13], якія ўключаюць і археалагічнае шурфаванне. Яго падтрымаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама К.А. Сумар. На жаль, даследаванні не далі чаканага выніку, але дазволілі канчаткова вызначыцца з магчымым месцам знаходжання Берасцейскай ратушы.

На вонкавы выгляд самой ратушы, часткова праліваюць святло адбіткі старажытных гарадскіх пячатак Берасця[14], якія знайшліся ў Вільні. Гэта дало магчымасць у 1937 годзе двум супрацоўнікам архіву ў Вільні выканаць рэканструкцыю пячаткі з лацінскім тэкстам: ***«CIVITATIS BRESTENSIS SIGILLUM SKABINORUM»***, што азначае: ***«ГОРАДА БЕРАСЦЕЙСКАГА ПЯЧАЦЬ ЛАЎНІКАЎ»***. Вядома, што на гарадской пячатцы ніяк не магла знайсці сабе месца замкавая вежа, як пра гэта часта паведамляецца, а больш лагічным і адпаведным можа з'яўляцца менавіта сімвалічная выява самога будынка гарадской ратушы. На карысць гэтага сведчыць і літаграфія Старога горада, выкананая польскім мастаком К.Ф. Ксаверыем прыкладна ў 1823 г. з боку Буга ад

---

10 Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссией. СПб., 1848. Т. 2 : 1506—1544.

11 Plan von der Stadt BRZESC in Litthauen [Дыяпазітыў] : [1740] / [G.M. fon Fürstenhoff]. [Берлін, 2007]. [Захоўваецца ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага].

12 Гладышчук А., Басаў С. Чаму Брэст без ратушы? // Вечерний Брест. 2008. 21 мая.

13 Рубашевский Ю. Ратуша на экране георадара // Вечерний Брест. 2008. 17 окт.

14 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 5. Воп. 1. Сп. № 2335. Л. .1, 48, 55, 56, 59 зв., 59, 68, 72, 76, 76 зв., 77.

Тэрэспаля падчас будаўніцтва шашы Варшава—Берасце. Сумяшчэнне вуглавых памераў з вядомымі тапаграфічнымі планамі Берасця дазваляюць зрабіць пазітыўны вынік, што занядбаны будынак на малюнку мог належаць менавіта гарадской ратушы старажытнага Берасця, прыярытэт якой у Беларусі не выклікае сумнення.

## III. ДРУКАРНЯ

***«Первая полать ринку. — Друкарня — $2^2/_3$ пруты волных».***

Аб месцы знаходжання Берасцейскай друкарні, якая ў 1553 годзе выдала першы друкаваны твор на тэрыторыі сучаснай Беларусі, было зроблена паведамленне на І-ай Міжнароднай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы»[15]. Знайсці гэтае месца дапамагло «Описаніе староства Берестейского 1566 года»: «...*Место в паркане. Рынок. Первая полать ринку. Садибы, пруты. Станислав Пекарский — $2^2/_3$; Яско Олфирович, где Миколай зять живет — $2^2/_3$; Друкарня — $2^2/_3$ волных; Серафен Новоселский — $2^3/_4$; Андрей золотарь — $2^1/_3$*...».

Самую вялікую славу Берасцейскай друкарні прынесла Берасцейская альбо Радзівілаўская Біблія. Адным з даследчыкаў апошняй стаў вядомы кнігазнаўца Мікола Нікалаеў[16]. Шэдэўр сусветнай культуры меў наступную поўную назву[17]: ***«Biblia swięta, to jest księgi Starego i Nowego zakonu wlasnie z żydowskiego, greckiego i lacinskiego nowo na polski język z pilnoscią i wierie wyłozone»***. Гэта было самае вялікае друкаванае выданне на той час у ВКЛ, якое ***«не тое што насіць — вазіць цяжкавата», — з'едліва сказаў пра гэты фаліянт арыянін Сымон Будны»***. Выданне Берасцейскай Бібліі было аздоблена незвычайнымі высокакласнымі гравюрамі невядомага майстра, як мяркуе Мікола Нікалаеў, — майстар быў спецыяльна для такой справы запрошаны Мікалаем Радзівілам Чорным, таму што ў кніжнай прадукцыі ВКЛ больш яго гравюры не сустракаюцца.

Сёння гэта вялікі гонар — мець дачыненне да вытокаў сусветнай культуры кнігадрукавання. Берасце на тэрыторыі Беларусі да гэтай важнай справы чалавецтва таксама мае прыярытэтнае дачыненне. За-



15 Гладышчук А. Там, дзе пачыналася кніга // Вечерний Брест. 2008. 31 окт.; Гладышчук А. А. Да вызначэння магчымага месцазнаходжання першай беларускай друкарні на тэрыторыі сучаснага мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» // Берасцейскія кнігазборы... Брэст, 2010. С. 254—259.

16 Нікалаеў М. В. Шэдэўр Брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Мінск, 1989. С. 144—149.

17 Нікалаеў М. В. Гісторыя беларускай кнігі. Мінск, 2009. Т. 1. С. 172—181.

стаецца толькі зрабіць адпаведны знак пра гэта ў тым месцы, дзе магла знаходзіцца першая Берасцейская друкарня.

## IV. «ШПИХЛИР СОЛНЫЙ»

***«На четвертой полатђ его к. мл. замокъ и шпихлир солный».***

Соль — гэта не проста тавар, гэта адна з першых патрэбаў забеспячэння жыццяздольнасці чалавека, і на гэтай справе ва ўсе часы будавалася стратэгія валодання і гандлю такім важным прадуктам харчавання, які сваім гаспадарам даваў усё неабходнае для забеспячэння ўлады і эканамічнага росту. Берасце паводле свайго геапалітычнага размяшчэння апынулася ў цэнтры скрыжавання гандлёвых шляхоў, у першую чаргу водных, па якіх гэты важны харчовы кампанент дастаўляўся да карыстальнікаў, таму горад ніяк не мог заставацца ў баку ад тых выгодаў, якія прыносіў гандаль соллю. Ніхто дасканала да сённяшняга дня не даследаваў гэты пласт шматграннай гісторыі эканамічнага развіцця сярэднявечнага Берасця. Але ў гэтым кантэксце нас будзе цікавіць толькі аб'ект з вельмі гучнай назвай «шпіхлір» альбо «шпіхлер солный».

Ён дасканала лакалізаваны ў рэестры замка 1566 года: *«Шпихлер солний великий у мосту замкового над Мухавцом на палахъ, в дерево мурований, о котором Волтбахъ справу давалъ, яко би то мелъ власнимъ коштомъ своимъ будовати».* Гэты запіс каралеўскага рэвізора растлумачвае, што менавіта *«шпихлер солний великий у мосту замкового над Мухавцом на палахъ, в дерево мурований»* стаяў. «Шпіхлер» на плане 1690 года і на самай справе знаходзіцца каля таго замкавага пад'ёмнага моста. Важна заўважыць, што «шпіхлер» быў пабудаваны на «палахъ», г. зн. на сваях, яго пабудаваў нехта Волтбах, і гэта магло здарыцца ў сярэдзіне XVI стагоддзя, калі гандаль соллю ў Берасці набраў моц.

Але вернемся да археалагічных даследаванняў ратушы ў жніўні 2009 г. Безвыніковы пошук фундаментаў старажытнай ратушы даў вельмі незвычайны вынік: з раскопу прыкладна на глыбіні 1,5 м з некранутага культурнага слоя выглянуў абрубак драўлянай сваі, якая магла адносіцца да XVI ст. Знаходка была вельмі неардынарнай, каб пакінуць яе без увагі. Гэты абрубак быў устаноўлены на плоскім камені і, безумоўна, нешта падпіраў. Калі цяпер яшчэ раз уважліва разгледзець малюнак К.Ф. Ксаверыя, то няцяжка заўважыць, што на ім толькі адзін будынак стаіць на палях якраз у тым месцы, дзе павінен быў знаходзіцца «шпіхлір солный». Цяпер застаецца адказаць на пытанне: «Ці накрыла яго пры будаўніцтве казарма крэпасці?» Адказ падказвае план графа

Опермана, на якім будынак, да якога маем інтарэс, на самай справе «выглядвае» з-пад казармы. Калі гэтыя разважанні знойдуць практычнае пацвярджэнне, то гэта азначае, што «солный шпіхлер» можа аказацца дасканалай рэпернай кропкай, якая дае надзею знайсці не толькі ратушу, але і іншыя аб'екты Старога горада.

А «шпіхлер солный» у Берасці ў другой палове XVI стагоддзя акрэсліваў не толькі адзін з галоўных прыярытэтаў эканамічнага развіцця горада, але быў найбуйнейшы ў ВКЛ.

## V. ЗЕКГАРЪ

***«На одной [веже] зекгаръ одъ места, который завжди бьетъ».***

Гэта вельмі цікавае і незвычайнае паведамленне 1566 года дае звесткі пра вельмі рэдкую з'яву для таго часу — вежавы гадзіннік. Гісторыя гадзіннікаў сярэднявечча — вельмі цікавая і захапляльная[18], абмяжуемся ў дадзенай працы толькі берасцейскімі гадзіннікамі. Так, іх на самай справе было два, але першы з'явіўся, хутчэй за ўсё, дзякуючы берасцейскаму старасце Мікалаю Радзівілу Чорнаму, які менавіта быў апошнім «рэстаўратарам цвярдыні Берасцейскай» і ўзвёў апошнюю вежу ў Берасцейскім замку з гадзіннікам, якая, дарэчы, магла выконваць і ролю кальвінісцкага сабору ў Берасці, які даследчыкам не ўдаецца лакалізаваць.

Другі гадзіннік у Берасці з'явіўся на ратушы пазней, хутчэй за ўсё, напрыканцы XVI стагоддзя: «*Ку тому месту волокъ 60. Повинность: Ведле привелею его крол. милости с каждой волоки вини до скринки месцкой платити по гр. 12, а за то на ратушу врядъ месцки зекгаръ направный мети и трубача ховати повиненъ*».

Гэта незвычайна рэдка, каб у адным горадзе ў тыя часы было адразу два гадзіннікі на вежах. Але з радзівілаўскім гадзіннікам вельмі жорстка абышлася прыродная стыхія[19]: «*1619 ...Того же року септемврія 11 буря була барзо великая, іже все дерево по садах поломила і вежу замковую в Бересті з годинником у воду вкинула і двур Сопіжин стерла*».

Тым не менш, факт існавання вежавых гадзіннікаў у Берасці для Беларусі таксама з'яўляецца прыярытэтным.

18 Пипуныров В. Н. История часов с древнейших времён до наших дней. М., 1982. 496 с.
19 Острозький літописець [Электронны рэсурс]. URL: http://litopys.org.ua (дата доступа: 24.10.2011).

## VI. РУРМУСЪ

***«Рурмусъ, або млинъ, с которого вода рурами до замку идетъ».***

Рэестр Берасцейскага замка 1566 года вельмі ёмка абазначыў наяўнасць у Берасці першага вадаправоду на тэрыторыі сённяшняй Беларусі: «*Рурмусъ, або млинъ, с которого вода руруми до замку идетъ, ободномъ колесе в одном валномъ великомъ, в которомъ сутъ помпи медяние, або спижние за штемплями желизними и иними потребами к тому належачими, железомъ опревеними; тамъ жо еще можетъ бити фалюшъ, або ступа на толчене пороху; тотъ домъ з вежицою; у дверей замокъ нутрний, в немъ свердловъ великихъ до верченя руръ 2*».

Гэта незвычайна рэдкае дасягненне тэхнічнай думкі ў той час для нашых земляў, якое прыйшло з Заходняй Еўропы. Сёння гэтай справе больш за 445 гадоў.

## VII. СОЛОДУВНИ И БРОВАРЫ

***«А такъ пляцовъ у перекопа месцкого, над Бугомъ, по погореню никому не дано и на нихъ солодувнѣ побудовано».***



Першая бочка берасцейскага піва ў пісьмовых крыніцах выплыла выпадкова і пры сумных абставінах пасля знішчальнага стыхійнага пажару ў Берасці ў 1525 годзе, калі «маскоўскія вязні» ў замкавай турме апынуліся ў крытычным становішчы[20]: «*А живности имъ передъ тымъ давали: на тыждень по два бараны, а по два бохоны на человѣка хлѣба, а по 10 головажень соли, <u>а по бочиѣ пива</u>; а теперь того имъ, повѣдають, не дають, о страву стоскують велми: «не будетъ ли дей жалованья господарского? не можемъ дей стрывати съ голоду*».

Фраза з рэестру 1566 года растлумачвае, дзе знаходзіліся ў той час у Берасці «солодувні і бровары»: «*Там же над Мухавцом броваровъ зрубленихъ посполу 4, котории за всими потребами комини и огнищами ново збудовавши жидомъ в аренду подани. Начине тежъ броварское всякое ведле потребе во всехъ броварахъ естъ, которие за пенязи замковие арендовние через жидов ново покуплено и по спущеню аренды таковое жъ отдати повинни. За тими бровари над Мухавцомъ ятка замковая для потреби битъя бидла замкового. <u>Солодувни две над Бугом от места подле перекопу, в нихъ озницъ мурованихъ 3 со всими потребами, в одной солодувнии печъ кафловая и коминъ</u>*».

20 Акты, относящиеся к истории Западной России. СПб., 1848. Т. 2. 1506—1544.

Вядома імя аднаго з першых піваварaў старажытнага Берасця: «*Хацъ пивоваръ*», якім хутчэй за ўсё з'яўляўся іншаземец, які пасяліўся ў Берасці, таму што пражываў па вуліцы Угрынцы.

## XVIII. АПТЭКА

***«Станиславъ аптикаръ — зять князя Симонов».***

Гэты прыярытэт у Беларусі Берасце раздзяляе з Пінскам. Імя першага берасцейскага аптэкара ў рэестры з'яўляецца тройчы:

— *Место его кролевской милости Берестейское. Место въ паркань. Рынокъ. Третяя полатъ ринку...Станиславъ аптикаръ, 2 пруты садибы...*

— *Надъ гостинцомъ Теребунскимъ. Станиславъ аптикаръ, 2 прути садибы, 8 прутов огороди...*

— *Волоки места Берестейского. ... Станиславъ аптикаръ, зять князя Симонов, 56 личбой влоки...*

Няпростай справай аказалася вызначыць, зяцем якога князя мог быць берасцейскі аптэкар, але дапамагла, як гэта часта здараецца, звычайная судовая справа паміж братам і сястрою: «*Олександра князь Михайло Глинскій, постановившися передъ нами очивисто у права, на жалобу его черезъ умоцованного своего Миколая Скиндера отказъ чинил тымъ обычаемъ: што се дотычетъ тое выправы з ыменей отчизныхъ той сестре моей, тогды-мъ ей дати не повиненъ с тыхъ причинъ, ижъ она первей того, будучи у в опеце дядька своего и моего тежъ князя Семена Ивановича Глинского и безъ воли и ведомости того дядька моего и иншыхъ кревныхъ, повиноватыхъ своихъ необычайне замужъ пошла за земенина господарского пана Станислава Войтеховича Войшвиловича, першого мужа своего...*».



Князь Міхаіл Іванавіч Глінскі (1505—1532), які памёр вельмі маладым, пакінуў сына Аляксандра і дачку Галену пад апекай свайго малодшага брата Сямёна Іванавіча (1514-1549), на што ўказвае змест сваркі паміж братам і сястрою: Такім чынам, поўнае імя першага берасцейскага аптэкара — Станіслаў Войцехавіч Вайшвілавіч, за якога «*тая братанка его [князя Семёна Ивановича] княжна Олена, будучи у в опеце его, замужъ необычайне, безъ воли его опекунское и иншыхъ кревныхъ своевольне замужъ пошла...*».

Што да Пінска (імя першага аптэкара таксама, як ні дзіўна, Станіслаў), то «Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княства» 1552—1555 гг. аптэкі

ў Пінску не згадвае[21], але ў «Пісцовай кнізе былога Пінскага старасства» знаходзім[22]: «…*Thamże uleczka mała za klasztorem… Druga połacz… Stanisław Aptekarz — 1 Pręt sielid.*». Дадзеная крыніца датавана, як і берасцейская, 1566 годам. Гэта першыя сведчанні развіцця аптэкарскай справы ў Беларусі.

## IX. МЫНЦА

Далёка не кожнаму сёння вядома, што ў Берасці паводле рашэння Варшаўскага сойму 1659 года быў створаны манетны двор (мынца), першы і адзіны на тэрыторыі Беларусі, які сваю працу распачаў 4 снежня 1665 года, а спыніў 16 снежня 1666 года, выдаўшы 240 680 150 медных берасцейскіх шэлягаў, якія больш вядомыя як «баратынкі» (ад імя Ціта Баратыні).

З прычыны фінансавага крызісу ў ВКЛ дзейнасць Берасцейскай мынцы была спынена, а абсталяванне *«старанна праінвентаравана і зложана ў адным з пограбаў»*[23]. Цяжка адказаць на пытанне, пра які склеп ідзе гаворка, але, хутчэй за ўсё гэта магло адбывацца на тэрыторыі Берасцейскага замка.

Чаму менавіта пра дзевяць прыярытэтаў Берасця ідзе гаворка ў гэтых нататках? На самай справе іх можа быць і, сапраўды, ёсць больш, але спынімся, каб перавесці дых і ад такой колькасці…

21 Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная Пинским Старостою Станиславом Хвальчевским в 1552—1555 гг. Вильна, 1884.

22 Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561—1566 годах пинским и кобринским старостою Лаврином Войною (с переводом на русский язык). Вильна, 1874. Ч. I.

23 Археографический сборник документов, относящихся к истории Северно-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа... Вильна, 1870. Т. IV : Акты Брестского городского суда.